ністэрства культуры, міжсаюзныя Дамы самадзейнай творчасці прафсаюзаў непасрэдна займаліся арганізацыяй фестываляў, конкурсаў, аглядаў, павышэннем кваліфікацый кіраўнікоў харавых калектываў і ансамблей, выданнем метадычных рэкамендацый і рэпертуару, стварэннем вакальна-харавых і фальклорных гурткоў, правядзеннем адкрытых рэпетыцый, заахвочваннем удзельнікаў і мастацкіх кіраўнікоў калектываў.

З свайго боку прафкомы прадпрыемстваў, калгасаў, саўгасаў і іншых установ асігнавалі значныя сродкі на ўдасканальванне матэрыяльнай базы мастацкай самадзейнасці, набыцце музычных інструментаў, сцэнічных касцюмаў, рэквізітаў.

У сучасны момант у сувязі с пераходам культурна-асветных установ на гаспадарчы разлік рэспубліканскія і абласныя навукова-метадычныя цэнтры Міністэрства культуры ператварылі ў Інстытут праблем культуры, а міжсаюзныя Дамы самадзейнай мастацкай творчасці наогул скасавалі.

Такім чынам усе калектывы мастацкай самадзейнасці апынуліся ў вельмі складаным становішчы. З аднаго боку ім няма каму аказваць метадычную і практычную дапамогу, а з другога – прафсаюзы перасталі фінансаваць набыцце сэнічных касцюмаў, музычных інструментаў, аплату працы кіраўнікоў і канцэртмайстараў, арганізацыю канкрэтных паездак і г.д. Вядома, калі рэпетыцыі творчых калектываў ператвараюцца ў самамэту, гэта не садзейнічае зацікаўленасці самадзейных артыстаў, і яны страчваюць жаданне ўдзельнічаць у мастацкай творчасці.

Аб гэтым красамоўна сведчыць такі факт, што толькі за 1992 год, у параўнанні з 1991 г., колькасць харавых калектываў у Беларусі скарацілася на 10%.

Калі гэты негатыўны працэс тэрмінова не спыніць, то не ў забаве замест нацыянальнага адраджэння ў галіне эстэтычнага выхавання нашага народа сродкамі самадзейнага мастацтва мы атрымаем поўнае і жудаснае яго разбурэнне.

## СПЕЦЫФІЧНЫЯ РЫСЫ РУСКАЙ ФІЛАСОФСКАЙ ДУМКІ

І.І.Смялянская

Тэрміналагічнае апісанне руху рускай думкі ў XIX стагод-

дзі перавалка звязана з дзвума паняццямі: "заходнічаства" і "славянафільства". Гэтыя тэрміны, з аднаго боку, могуць быць інтэрпрэціраваны канкрэтна і аднесяны да акрэсленай групы людзей, і лакалізаваны ў граніцах невялікага адрэзка часу. З другога боку, гэтыя тэрміны імкнуцца да расплывчатасці. Кожны з іх - і "заходнічаства", і "славянафільства" - падразумяваюць не проста пункты гледжання якога-небудзь чалавека ў вызначаны перыяд XIX стагоддзя, а сінтэз поглядаў, арыентацый, прадпасылак, даючых універсальныя адказы на ўніверсальныя філасофскія пытанні. Таму ў традыцыі разумення і выкладання гісторыі рускай філасофіі існуюць розныя падыходы. Ёсць гісторыкі, строга лакалізуючыя "заходнічаства" і "славянафільства", скажам, у адрэзку 40-50-х гадоў XIX стагоддзя. Яны адказваюцца экстрапаліраваць гэтыя тэрміны на другі час. Другія аддаюць перавагу, матывіруючы дастаткова глыбока, выкарыстоўваць гэтыя тэрміны як універсальныя катэгорыі паняцця руху рускай філасофскай думкі ў XIX стагоддзі.

Але каб паказаць унутраную логіку развіцця рускай філасофскай думкі больш прадуктыўна, на мой погляд, будзе вылучаць тры лініі, палярызаваныя ўнутры сябе. У выніку мы атрымаем "стэрыяскапічнае", трохмернае бачанне прастранства думак XIX стагоддзя. Падобнае структураванне можа прымяняцца да любых форм філасофскай думкі.

| | | | |
|---|---|---|---|
| Сфера пазнання: | Навука | - | Рэлігія |
| Сфера дзеяння: | Сацыялізм (Анархізм) | - | Манархія |
| Сфера каштоўнасцей: | Асоба | - | Татальнасць |

Такім чынам, першы ўзровень структуравання рускай філасофскай думкі XIX стагоддзя - гэта светапоглядавы ўзровень выбару: "рэлігія" ці "навука".

Сярэдні ўзровень - дапускае канцэнтрацыю думкі аб праблеме чалавечага жыцця, уладкавання, уладкавання чалавечага быцця на зямлі і пошука адэкватных, адпавядаючых прадстаўленням аб чалавеку, форм сацыяльнага быцця. Калі на першым паверсе мы маем размяжаванасць рэлігіі і навукі - рэлігія справа, навука злева, то на другім, сярэднім, паверсе будзем меці размяжава-

насць: манархія - справа пад рэлігіяй, злева пад навукай - сацыялізм, у граніцы - адмаўленне усіх дзяржаўных форм - анархізм.

І, канчатковае, апошні, базісны ўзровень - гэта разважанні пра самога чалавека, пра тое, хто з'яўляецца суб'ектам, можна сказаць, носьбітам, і усіх форм уласнага жыццяўладкавання, і суб'ектам погляда на іх - носьбітам светапогляду. Гэта - прадстаўленне аб чалавеку, якое размяжоўваецца ў апазіцыі: злева - асоба, справа - "саборнасць" ці "татальнасць".

У выніку, руская філасофія XIX стагоддзя структурыруецца на трох узроўнях, кожны з каторых мае свае полюсы. Верхні узровень - ўзровень светапогляду, размяжоўваемы ў граніцах "рэлігія - навука"; сярэдні ўзровень - ўзровень формы ўладкавання чалавечага быцця: "манархія - анархія"; ніжэйшы, фундаментальны ўзровень - прадстаўленне аб самім чалавеку: "асоба - татальнасць".

## ПЫТАННІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА І АГУЛЬНАЧАЛАВЕЧАГА У БЕЛАРУСКАЙ МАСТАЦКАЙ КРЫТЫЦЫ 1920-х ГАДОЎ

У.К.Зяневіч

Нацыянальна-культурнае адраджэньне 1920-х гг. суправаджалася інтэнсіўным разьвіцьцем музычнага і агульначалавечага ў мастацтве і ў музыцы у прыватнасьці.

У гэты перыяд актыўна фарміруюцца канцэпцыі нацыянальнай музыкі, якія адлюстравалі эстэтычныя погляды і грамадска-палітычныя арыентацыі розных сацыяльных і нацыянальных груп насельніцтва Беларусі 1920 гг.

Выявіліся дзве палярна супрацьлеглыя тэндэнцыі, якія сваімі карэньнямі меді, па-першае, старую нацыянал-шавіністычную палітыку царскага ураду у адносінах да культур "окраін Российской империи", так званы "заходнерусізм". Паводле тэорыі "западнарусізму", якія ў беларускім друку 1920-гг. набылі назву "нацыянальнага нігілізму", будучыня беларускай культуры, лёс музычнага мастацтва залежала ад таго, у якой ступені "сацыялістычная Беларусь" здолее пераадоліць старое, традыцыю, "блеяньне нуднае ягнят", гэта значыць, у якой ступені Беларусь здо-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ